# Нашыя універсітэты

Успаміны-успаміны, як тыя плыні марскія: быццам бы толькі пасхалі на фэст жыцця, а ужо з яго заехалі ў нейкую незнаёмую мясцовасць... Ці, як выразна выказаўся Валодзя Конан, сустрэўшы нядаўна сваіх равеснікаў на прыёме ў паліклініцы былой лечкамісіі: «Згуртаваліся для апошняга рашучага ўзыходжання». Відавочна, што ён ніколі не згубіць гумару і, трэба сказаць, што гэта яго сутнасць.

У свой час, калі мы сустрэліся ў інстытуце філасофіі Акадэміі навук БССР, я даведаўся, што ён скончыў тую самую alma mater, што і я. Але больш цікава тое, што мы аказаліся яшчэ і землякамі – ён з вёскі на Навагрудчыне побач з маёй. Гэта нас зблізіла і аб'яднала ў невялічкі творчы двуумвірат па кнізе, прысвечанай эстэтыцы Беларусі, якую выдалі зусім выпадкова ў Маскве ў выдавецтве «Мастацтва». А справа была так – мяне паслаў у Маскву наш тагачасны дырэктар інстытута філасофіі Казімір Буслаў на канферэнцыю аб'яднання «Веды». Я ўзяў з сабой маленькую дачку – паказаць Маскву, а па прыбыцці заехаў у выдавецтва «Мастацтва» ў надзеі атрымаць свой ганарар за нашыя матэрыялы ў анталогіі другога тома «Эстетыкі». Ганарар не атрымаў, але рэдактар прапанаваў напісаць кнігу па эстэтыцы Беларусі. Я згадзіўся пры ўмове, што напішу ў сааўтарстве з Конанам. Нам далі папярэднюю згоду, папрасіўшы за тры дні напісаць і даслаць план-праспект кнігі. Мы яго напісалі і «благаславілі» чырвоным малдаўскім віном з бочкі на Камароўскім рынку. Праз тры-чатыры дні атрымалі дагавор на выданне кнігі з подпісам дырэктара выдавецтва «Мастацтва». Гэта здавалася нейкай фантастыкай, тым больш што ганарар быў па тым часе вельмі высокі.

Аб працаздольнасці Уладзіміра Конана я ведаю не з размоў і легенд (былі і такія – і смешныя, і пяшчотныя), што хадзілі ў навуковых колах. Калі мы пісалі «Эстэтыку», а адбывалася гэта збольшага ў Санкт-Пецярбургу, працавалі па шэсць дзён на тыдзень, побач: Валодзя – у бібліятэцы на Фантанцы (там зала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часопісаў), а я ў Шчадрынцы (бібліятэка імя Салтыкова-Шчадрына). Адпачывалі – гэта значыць наведвалі музеі, тэатры і цікавыя мясціны Пецярбурга – толькі ў нядзелю, але і гэта дало нам шмат цікавага. Наогул, паўночная сталіца Расіі нам вельмі падабалася. Абышлі мы яе ў той час пехам амаль усю, узгадваючы нашых землякоў, якія ў былыя часы жылі ў Піцеры – Яленскага, Каліноўскага і шматлікіх іншых.

У Вільнюсе, дзе завяршалася работа над кнігай, мы адчувалі сябе як дома. Гэта доўгі час быў фактычна горад нашай, беларускай, культуры, якая паўнавартасна існавала побач з іншымі. Тут, у Вільні, нам быў вядомы кожны культурны артэфакт, асабліва калі ён меў дачыненне да Беларусі. Неяк я падлічваў, колькі часу мы правялі ў гэтым культурным цэнтры. Атрымалася, каля 5 год. У шматлікіх аддзелах віленскіх бібліятэк, архіваў Конан ведаў усё, што тычылася яго навуковых інтарэсаў (а кола іх было неаглядным). Па разнастайнасці і паспяховасці пошукаў яго можна параўнаць, мне здаецца, толькі з Адамам Мальдзісам.

Уладзімір Конан – выдатны гісторык, літаратуравед, фалькларыст, эстэтык, але перш за ўсё – гісторык філасофіі. На мой погляд, у ім увасобіўся архетып літаратара, беларуса-мысліўца. Не выпадкова менавіта Конану належала першая распрацоўка архетыпаў культуры Беларусі. Усё творчае жыццё Конан імкнецца да вытокаў народнага Духу, вывучае яго крыніцу – фальклор. Найбольшы аб'ект яго захаплення – родная паэзія, песня, казка – усё тое, у чым навечна ўвасобілася душа беларускага народа.

Я гэта адчуваю не толькі ў творах Уладзіміра Конана, мне пашчасціла бачыць яго вочы і чуць яго словы аб гэтым на нашай з ім малой радзіме – на Навагрудчыне. Гэта сапраўды паэтычныя, эстэтычныя мясціны, з цудоўнымі песнямі, моваў, людзьмі, «соль зямлі» якіх нясе праз жыццё і ўвасабляе ў сваіх творах Уладзімір Конан.

*Энгельс ДАРАШЭВІЧ,*
*доктар філасофскіх навук, прафесар*
*17 кастрычніка 2008 г.*

*Першая публікацыя*